ВЯРНІЦЕ КНІГІ

У кастрычніку бягучага года будаўнікі здадуць у эксплуатацыю новае памяшканне абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна. Гэта будзе каштоўны падарунак жыхарам нашага горада. У новым памяшканні прадугледжана ўсё для плённай работы над кнігай. У чытальных залах (а іх будзе некалькі) змогуць адначасова працаваць каля 400 чалавек.

А пакуль бібліятэка вядзе падрыхтоўчыя работы. Нам неабходна зрабіць праверку кніжнага фонду (звыш 300 тысяч экземпляраў), правесці адпаведныя работы па стварэнню бібліяграфічнага апарату, арганізаваць новыя аддзелы (мастацтва, тэхнічнай, сельскагаспадарчай і замежнай літаратуры) і г. д.

Але больш за ўсё нас турбуе лёс нашых кніжак, якія знаходзяцца ў чытачоў. Кожны год мы абслугоўваем каля 15 тысяч чалавек. Калі ўявіць, што ў кожнага чытача знаходзіцца тры кніжкі, то гэта складае адзнай значную лічбу. Абанемент жа не можа прыступіць да праверкі фонду, пакуль кніжкі не будуць вернуты.

Мы ў вялікай дружбе з многімі нашымі наведвальнікамі. Адным з іх мы дапамаглі ў набыцці адукацыі, другім — у працы, трэцім — у павышэнні свайго культурнага ўзроўню. І яны з удзячнасцю ўспамінаюць нашу бібліятэку і таварышаў, якія тут працуюць.

Але ёсць і другая катэгорыя чытачоў. Гэта людзі, якія памятаюць пра бібліятэку толькі тады, калі ім неабходна ўзяць кніжку. А потым дарога ў бібліятэку забываецца трывала. Часам на некалькі гадоў. Я нікольні не перабольшваю. Напрыклад, Г. П. Жураўлёва, Н. А. Фаміна, Е. І. Жаліч, К. І. Мацкевіч і, на жаль, многія іншыя не вярнулі кніжкі, узятыя яшчэ ў 1964 годзе. Некалькі разоў гэтым чытачам мы пасылалі паштоўкі, звянілі па тэлефоне. Нарэшце мы вымушаны пасылаць ім напамінкі праз суд. Прыкра і, здаецца, неверагодна. Але што зробіш. На іншых толькі гэта і дзейнічае.

Ці вось другі яскравы малюнак. Мы звяртаемся за дапамогай да нашай грамадскасці. У актыве абанемента больш 20 пенсіянераўактывістаў, якія дапамагаюць нам у зборы кніг. Уявіце цяпер, як на трэці ці чацвёрты паверх узнімаецца пенсіянер, каб яшчэ раз напомніць юнаку або дзяўчыне, што час карыстання бібліятэчнай кніжкай даўно мінуў і яе трэба вярнуць. Тут жа прапануе свае паслугі, бярэ ад чытача затрыманую ім кніжку і нясе ў бібліятэку. Вось да якіх «вяршынь культуры» абслугоўвання мы падымаемся!

Становішча, якое склалася, вымушае нас звярнуцца праз газету да сваіх чытачоў. Трэба ў бліжэйшы час прынесці ў бібліятэку нашы кніжкі. Мы працуем з 9 гадзін раніцы да 17 гадзін. Выхадны дзень у нядзелю. Ад таго, наколькі своечасова будуць вернуты кніжкі, залежыць хуткая праверка кніжнага фонду, а значыць, і хутчэйшае адкрыццё новай бібліятэкі.

А. ФІЛІМОНАЎ,
нам. дырэктара абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна.